КАІР. Ірак афіцыйна адхіліў новы англа-амерыканскі план, якім прадугледжваецца дазвол Багдаду экспарціраваць велізарную колькасць нафты з мэтай задавальнення гуманітарных патрэб іракцаў. Як тут стала вядома, адпаведны праект рэзалюцыі, выпрацаваны ЗША і Вялікабрытаніяй, быў даведзены да ведама Савета Бяспекі ААН Аргенцінай.

Сумесныя вучэнні

СЕУЛ. ЗША і Паўднёвая Карэя правялі сумесныя ваенна-марскія вучэнні з удзелам амерыканскага авіяносца "Індэпендэнс", які здзяйсняў "звычайны вучэбны паход" ля паўднёвай часткі Карэйскага паўвострава, абвясціла міністэрства абароны Рэспублікі Карэя. Вучэнні праходзілі 21—24 сакавіка каля вострава Чэчжуда.

Уцяклі ад помсты

ТОКІО. Відаць, імкнучыся пазбегнуць помсты, некалькі адэптаў японскай рэлігійнай секты "АУМ сінрыкіо" ўцяклі з краіны на яхце. Як паведамляецца ў такійскім друку, яны выкарысталі адну з пяці належачых секце яхт, якія пастаянна знаходзяцца ў невялікім порце ў суседняй з Токіо прэфектуры Ціба. Паліцыя трымала гэтую "флатылію" пад пастаянным наглядам, але не змагла прадухіліць уцёкі членаў секты, якая падазраваецца ў арганізацыі масавага атручэння ў такійскай падземцы 20 сакавіка.

Водпуск Б.Ельцына

МАСКВА. Прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын цягніком з Казанскага вакзала накіраваўся ў адпачынак. Упершыню кіраўнік расійскай дзяржавы адпраўляецца ў паездку па краіне не самалётам, а па чыгунцы. У гутарцы з журналістамі ён падкрэсліў, што гэтую паездку трэба разглядаць перш за ўсё як дзелавую. Закранаючы майскую сустрэчу з прэзідэнтам ЗША Білам Клінтанам, Барыс Ельцын сярод самых складных пытанняў вызначыў праблему продажу Ірану расійскіх атамных рэактараў, а таксама сітуацыю ў Чэчні.

Американцы берутся за рублевые переводы

Вице-президент американской компании Western Union Financial Services International по Восточной Европе Джон Скиннер объявил о начале операций по рублевым переводам внутри России.

Услуга рассчитана только на физических лиц. Россияне смогут перевести неограниченный объем средств в любую точку страны, где есть банки, заключившие контракт с Western Union. В настоящее время рублевые переводы осуществляются Western Union через отделения банка "Российский кредит" и Межэкономсбербанка в 10 городах.

Компания объявила своей целью открытие к концу 1995 года агентств во всех городах России с населением более 500 тыс. человек.

Минимальные сроки переводов в Western Union составляют от 10 до 15 минут.

TOP DAILY NEWS — РИД.

Брытанцы — відэаманьякі

Вялікабрытанія — гэта краіна "відэаманьякаў", якія ахоплены страсцю да паездак на аўтамашынах па перапоўненых аўтамагістралях і адмаўляюцца ад традыцыйных адбіўных з ялавічыны на карысць курацiны і салаты. Такі абагульнены партрэт сярэдняга брытанца, складзены на аснове даных толькі што выйшаўшага з друку афіцыйнага даведніка "Вялікабрытанія — 1995 год: 50 гадоў перамен".

Упершыню гэты статыстычны даведнік па Злучанаму Каралеўству быў выдадзены ў 1945 годзе. У ім шмат даных пра краіну і яе людзей. Жанчыны складаюць зараз палавіну ўсяго працаздольнага насельніцтва туманнага Альбіёна, і больш 740 тысяч з іх маюць сваю ўласную справу. Сярэдняя працягласць жыцця прадстаўнікоў моцнага полу — 73 гады, а ў іх "слабых" спадарожніц жыцця — 78 гадоў.

Кожны тыдзень брытанскія відэатэкі выдаюць напракат 6 мільёнаў відэакасет, а сярэдні брытанец штодзённа праводзіць перад дамашнім блакітным экранам больш як 3,5 гадзіны. У 1950 годзе ў Вялікабрытаніі не існавала хуткасных аўтастрад. Сёння ж іх працягласць перавышае 2 тысячы кіламетраў. Часта і гэтага бывае недастаткова для зарэгістраваных у краіне 20 мільёнаў аўтамашын. Яны стварылі новыя праблемы ў плане аховы навакольнага асяроддзя, хоць англійскія гарады ачысціліся ад смогу, прычынай якога былі мільёны вугальных камінаў.

Калі верыць статыстыцы, брытанцы ўсё больш адмаўляюцца ад ялавічыны, бараніны, свініны, цукру і тлушчаў, аддаючы перавагу курацiне і салаце.

Зрэшты, як адзначаецца ў прадмове да зборніка, некаторыя рэчы непадуладныя змяненням. Насельнікі гэтых астравоў па-ранейшаму лічаць, што "Вялікабрытанія — гэта найгоршая для пражывання краіна ў свеце, вядома, калі не лічыць усіх астатніх".

Ігар ПОЛЬСКІ,
Вялікабрытанія.

Нецэнзурнай лаянкай зацікавіліся... акадэмікі Расіі

Група навукоўцаў Інстытута рускай мовы РАН пад кіраўніцтвам двух дактароў навук падрыхтавала да выдання унікальны ў гісторыі айчыннага выдавецтва твор — "Руская запаведная ідыяматыка". Працей кажучы — слоўнік папулярнай у народзе расійскай нецэнзурнай лаянкі.

Над ім працавалі больш за сем гадоў, усебакова абгрунтоўваючы з навуковага пункту гледжання ўжыванне кожнага мацернага слова. Незвычайны слоўнік мае памер каля 400 старонак. У якасці "жывых" прыкладаў ужывання народам нецэнзурнай лаянкі ў розных жыццёвых сітуацыях бяруцца прыпеўкі, анекдоты, творы шэрагу класікаў. Але найбольш каштоўным аб'ектам ідыяматыкі сталі творы скандальна вядомых пісьменнікаў-эмігрантаў Юза Аляшкоўскага і Эдуарда Лімонава.

Унікальнае даследаванне дасціпна вызначае сэнс кожнага слова, у ім прыводзяцца розныя варыянты практычнага ўжывання "шэдэўраў" рускай мовы ў літаратуры і бытавых размовах, указваюцца род, склон назоўнікаў і іншыя граматычныя характарыстыкі. Даследчыкі моўнай "залатой жылы" схіляюцца да вываду, што народнае брыдкаслоўе таксама адносіцца да своеасаблівай спадчыны славян. А некаторыя медыкі кажуць, што эмацыянальная лаянка спрыяе выхаду адмоўнай энергіі, што гэта своеасаблівы "клапан" для нервовых перагрузак. Аднак акадэмікі папярэджваюць: бяздумнае, без дай прычыны брыдкаслоўе не спрыяе "лячэнню" чалавека. Так што, шаноўныя грамадзяне, не спяшайцеся выказвацца "ад душы", калі вам вельмі закарцела паслаць таго-сяго куды-небудзь ...

Леанід ФАДЗЕЕЎ,
уласны карэспандэнт "Народнай газеты" ў Маскве.

"Багатыя таксама плачуць". Аднак не ўсе...

Таня Вінтэр

Гэта жанчына не багатая і не вядомая, але імя яе ў Беларусі павінны ведаць: яна арганізоўвае адпачынак беларускіх дзяцей, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы, у каліфарнійскім горадзе Сан-Дыега. Таня (яна просіць называць сябе менавіта так) — руская амерыканка, якая нарадзілася ў Францыі, але душа яе поўнасцю аддадзена Айчыне.

— Некалькі гадоў назад, — расказвае пані Вінтэр, — мой сын запрасіў на лета хлопчыка-беларуса, які пацярпеў ад Чарнобыля. Мы пасябравалі. Потым ён паехаў дадому і... знік. І я паехала ў Беларусь яго шукаць. Знайшла ў невялікім гарадку пад Магілёвам. Але там я ўбачыла шмат дзяцей, якія мелі патрэбу ў здаровым клімаце, якім славуты Сан-Дыега.

Так узнікла ідэя прывезці групу беларускіх дзяцей у паўднёвую Каліфорнію. У мінулым годзе беларуская дабрачынная арганізацыя "Медыцына і Чарнобыль" прывезла ў Каліфорнію групу дзяцей. Іх суправаджаў вучоны-ядзершчык з Мінска Эмануіл Валмянскі, які пераклаў кнігу вядомага амерыканскага фізіка Джона Гофмана, прысвечаную чарнобыльскай праблеме і дзецям.

Наўрад ці гэтая паездка адбылася б, калі б не Таня Вінтэр. Справа ў тым, што дзярждэпартамент запатрабаваў за кожную візу для дзіцяці па 60 долараў. Дзе ж матулям гэтых дзяцей узяць такія грошы? Выдаткі ўзяла на сябе Таня Вінтэр. Пры гэтым яна падключыла прэсу. Але не дапамагло: чыноўніцкія лбы ў ЗША таксама непрабівальныя, як і ў былым СССР. І пані Вінтэр сама аплаціла ўсе выдаткі. Дзеці жылі ў амерыканскіх сем'ях, сустракаліся з аднагодкамі, купаліся ў акіяне, умацавалі сваю імунную сістэму.

Таня Вінтэр рыхтуецца прыняць беларускіх дзяцей і гэтым летам. Яна звярнулася да рускамоўных сем'яў Сан-Дыега з заклікам уключыцца ў праграму "Дзеці Чарнобыля" і ўзяць на лета (на пяць-шэсць тыдняў) дзяцей з беларускіх гарадоў і вёсак. Кантактны тэлефон пані Вінтэр апублікаваны ў рускіх газетах Каліфорніі. І многія ўжо адгукнуліся на заклік высакароднай жанчыны.

Анджэла Дэвіс

Памятаеце гэтае імя? У свой час многія з нас удзельнічалі ў дэманстрацыях і мітынгах у абарону гэтай жанчыны, якія праходзілі на ўсёй прасторы сацыялістычнага лагера пад дэвізам "Рукі прэч ад Анджэлы Дэвіс!" Яе хацелі пасадзіць за прыналежнасць да арганізацыі "Чорныя пантэры", якая забіла некалькі паліцэйскіх. А мы "мітынгавалі" ў яе абарону таму, што нам сказалі: "Судзяць Анджэлу за тое, што яна камуністка і негрыцянка". Яе выпусцілі з турмы, але не з-за нашых пратэстаў, а таму, што суд не знайшоў дастатковых доказаў, якія б пацвярджалі абвінавачанне. І тады Анджэла стала нацыянальнай гераіняй краін сацыялістычнай садружнасці, яе нават абралі намеснікам генеральнага сакратара кампартыі ЗША.

І вось навіна: напярэдадні 75-годдзя кампартыі ЗША, якое адзначалася ў канцы мінулага года, нацыянальны старшыня кампартыі ЗША Гэс Хол прагнаў Анджэлу Дэвіс з кіраўніцтва партыі за "дысідэнцтва і рэвізіянізм". Яна палымяна выступала за тое, каб прыстасаваць кампартыю Амерыкі да гістарычнага моманту, і за супрацоўніцтва з Генадзем Зюганавым і Нінай Андрэевай.

Чым жа цяпер займаецца палымяная "чорная пантэра"? Яна знайшла сабе справу, узначаліўшы... унітарыянскую царкву. Што гэта такое, я і сам не ведаю, як і не магу зразумець, наколькі рэлігія сумяшчаецца з камуністычнымі ідэаламі Ніны Андрэевай і Анджэлы Дэвіс. Але гераіня "нашага часу" стала душапрыказчыцай... лесбіянак у горадзе Сан-Францыска. Апошняе, што яна зрабіла, — гэта з'яднала шлюбам дзвюх футбалістак — Шэрыл Дзінер і Лары Гідас. Хто з іх муж, а хто жонка — сказаць цяжка, але апранутая ў спецыяльны цырыманіяльны балахон Анджэла сказала палымяную прамову аб тым, што гэтае вяселле "натхніць грамадства на прызнанне і павагу асаблівай прыгажосці лесбіянскага кахання". І яшчэ адзін перл, які сарваўся з вуснаў былой камуністкі: "Сказаць "я вас кахаю" раўназначна закліку "Няхай жыве рэвалюцыя!"

Майкл Джэксан

Кароль Санву, сын караля Нана Амона Ндоўфоу Чацвёртага, правіцеля Берага Слановай Косці і ўпраўляючага каралеўствам Санау ў Гане. Гэты тытул пры захаванні ўсіх урачыстых рытуалаў атрымаў нядаўна кароль поп-музыкі Майкл Джэксан. Хоць пасля гісторый аб сексуальных дамаганнях і чапляннях да малалетак трон пад поп-каралём пачаў хістацца (некаторыя фірмы скасавалі з ім кантракты, а самому Джэксану давялося адкупляцца мільёнамі ад шантажыруючых яго істцоў), ваяж у Афрыку ўмацаваў яго маральны дух і матэрыяльнае становішча. Тым часам ён моцна пасябраваў з афрыканскім каралём, які назваў яго сваім сынам і цяпер збіраецца да яго з візітам у Лос-Анджэлес.

Уладзімір ЛЕВІН,
уласны карэспандэнт "Народнай газеты" ў ЗША.

Навіны Літвы

Каралеўскія манеты ў абмен на чабурэкі

У старой частцы Каўнаса экскаватар выкапаў гаршчочак, напоўнены залатымі і сярэбранымі манетамі. Здарылася гэта ля сцяны звычайнай пяціпавярхоўкі, што непадалёку ад царквы св. Мікалоюса, заступніка купцоў.

Будаўнікі не заўважылі знаходкі. Напалі на яе ўсюдыісныя хлапчукі, за імі рушылі і дарослыя. Зямлю і рукамі перабіралі, і граблямі, несучы ўсё чыста.

Археолагі і паліцыя даведаліся аб кладзе з гарадскіх размоў і публікацый у мясцовых газетах. Гісторый аб тым, як старажытныя дукаты XVI стагоддзя дзеці мянялі на піцу, чабурэкі і кока-колу, з'яўляецца ўсё больш. Манеты, забраныя ў аднаго з "кладашукальнікаў", пасля ачысткі зазіхацелі старым серабром і золатам. Паводле ацэнкі, залаты дукат зараз каштуе 1000 долараў. Мяркуецца, што сярод дукатаў, якія цяпер гуляюць па руках, ёсць манеты, адчаканеныя ў сярэдзіне XVI стагоддзя каралём Жыгімонтам Аўгустам. У літоўскіх музеях да гэтага часу няма ніводнага такога экспаната. Хіба толькі крыміналісты знойдуць рэшткі гэтага клада і вернуць у музей.

Як прэса "зваліла" саветніка прэзідэнта

Прэзідэнт Альгірдас Бразаўскас падпісаў распараджэнне аб вызваленні свайго саветніка па пытаннях дзяржавы і права Рымаса Андрыкіса.

У поле зроку літоўскай прэсы ён трапіў некалькі гадоў назад. У 1990 годзе Р.Андрыкіса прадвызначалі на пасаду старшыні Вярхоўнага суда. Адзін з кіраўнікоў МУС тады заявіў: да ўлады прыходзіць мафія. Шосты аддзел МУС, які збіраў інфармацыю пра кандыдатаў на высокія дзяржаўныя пасады, прадаставіў тады такія даныя, што Р.Андрыкіса выкраслілі са спісу. У 1985 годзе Р.Андрыкіс, з'яўляючыся членам Вярхоўнага суда, узяў пад сваё крыло групу каўнасцаў, падазроных у вырабе і збыце фальсіфікаванай гарэлкі. Затрымалі іх тады ў Молецкім раёне, і Р.Андрыкіс не паленаваўся паехаць туды. Мясцовыя вартавыя парадку расцанілі гэты ваяж як націск на карысць арыштаваных.

Пасля Вярхоўнага суда Р.Андрыкіс заняўся адвакацкай дзейнасцю, заснаваў сваю адвакацкую кантору SPES. У ліку яе кліентаў былі члены групы рэкеціраў з Таўраге, затрыманай паліцыяй, і іншых злачынных груповак.

Усё гэта не перашкодзіла Р.Андрыкісу ў 1993 годзе стаць саветнікам прэзідэнта. Але імя яго вельмі часта мільгацела ў друку, і прэзідэнт прыняў рашэнне аб яго вызваленні, днём раней атрымаўшы заяву аб звальненні па ўласнаму жаданню. Відаць, пану прэзідэнту надакучылі скандальныя публікацыі пра свайго саветніка.

Ігар ВІНЯНКОЎ,
уласны карэспандэнт "Народнай газеты" па краінах Балтыі.

В космосе еще одна "Земля"?

Астрономы скоро приступят к целенаправленному поиску в космосе второй "Земли"

Еще до конца столетия астрономы получат в свое распоряжение инструменты, которые позволят приступить к целенаправленному поиску в космосе второй "Земли". Как сообщил на проходившей в Атланте (штат Джорджия) конференции Американской ассоциации содействия развитию науки астроном НАСА Стив Маран, в 1997 году на космическом телескопе "Хаббл" предполагается дополнительно установить спектрограф высокого разрешения и новую фотокамеру. С их помощью ученые надеются получить снимки двух звезд в созвездиях Центавр и Эридан, находящихся на расстоянии менее 15 световых лет от Солнечной системы. Эти две звезды, отметил Маран, давно привлекают внимание астрономов, поскольку по своим характеристикам — размерам и температуре — напоминают наше Солнце и имеют примерно такой же возраст. "Мы вычислили, — отметил Маран, — что если у этих звезд есть подобные нашему Юпитеру планеты и они находятся от них на таком же расстоянии, как Юпитер от Солнца, то с помощью новых инструментов мы сможем их обнаружить".

Именно планеты размером с Юпитер являются ключом к поиску второй "Земли", считает сотрудник Астрофизического центра Гарвардского университета Дэвид Лэсэм. Юпитер — самая большая планета нашей Солнечной системы, и такие космические тела в звездных структурах обнаружить гораздо легче, подчеркнул Лэсэм, отметив, что "если удастся подтвердить существование такой планеты, то логично предположить, что где-то рядом есть и другие, но меньшие по размеру".

Астроному из Пенсильванского университета Александру Волсцану три года назад путем расчетов без визуального подтверждения удалось уже предсказать существование трех планет в других созвездиях. Однако они вращаются вокруг пульсара, излучающего мало света, в силу чего жизнь на них вряд ли могла зародиться.

По словам сотрудника Института космических телескопов Р.Брауна, в 1999 и 2005 годах на "Хаббл" будут доставлены еще более совершенные астрономические инструменты. И тогда у ученых появится реальная возможность ответить на вопросы, уже не одно столетие волнующие человечество: одиноки ли мы во Вселенной? Является ли Земля единственной планетой, где могла возникнуть жизнь? Мы будем концентрировать поиски, отметил Браун, на так называемых зонах жизни вокруг далеких звезд. В эти зоны включаются планеты, находящиеся на таких орбитах, где энергия звезд лишь согревает планеты, не приводя к полному испарению воды с их поверхности. Ведь, как подчеркнул Браун, "пока наше понимание жизни предполагает обязательное наличие воды".

Александр ПАХОМОВ.
Нью-Йорк.

ВАМ ЗБІРАЮЦЦА ПАКАЗАЦЬ...

Гэтых дзён не змоўкне слава...

Зусім мала часу аддзяляе нас ад таго знаменальнага дня, калі будзе святкавацца адно з самых велічных святаў нашага народа — Дзень вялікай Перамогі.

Ужо 50 гадоў, як няма над нашай зямлёй чорных хмар вайны, 50 гадоў... За гэты час паспелі вырасці і нават пастарэць цэлыя пакаленні. Большасць з нас, цяперашніх, не ведала вайны, не прайшла праз увесь жах яе вогненнага пекла. Але тым не менш народная памяць у сваёй пераемнасці зноў і зноў нагадвае нам праз дзесяцігоддзі аб немагчымасці паўтарэння такога дзікага нападу — вайны і фашызму. І адказнасць за гэта нясём мы і нашыя дзеці.

Як адно з праяўленняў народнай памяці — тэматычныя паказы фільмаў пра вайну, якія праводзяцца цяпер па ўсёй рэспубліцы ў гонар 50-годдзя вялікай Перамогі. З хваляваннем убачаць гледачы такія мастацкія кінастужкі, як "Тут твой фронт", "Доктар Вера", "Дума пра Каўпака", "Чакай мяне", "Іх ведалі ў твар", "Кароткія сустрэчы на доўгай вайне", "Ракеты не павінны ўзляцець", "Прыступіць да ліквідацыі", "Моцныя духам", "Ты павінен жыць", "Фронт у тыле ворага", "Хлеб пароўну" і інш.

"Падмаскоўныя вечары"

Карціна створана кінематаграфістамі Масквы. Аўтары сцэнарыя — Марына Шаптунова і Станіслаў Гаварухін.

Рэжысёр Валерый Тадароўскі — вядома, адзін з лідэраў новага расійскага кіно, імя якому прынеслі яго таленавітыя фільмы "Катафалк" і "Каханне". І вось "Падмаскоўныя вечары" — вольная інтэрпрэтацыя нарыса Ляскова "Лэдзі Макбет Мцэнскага павета", паводле сюжэту якога напісаў славутую оперу "Кацярына Ізмайлава" Дзмітрый Шастаковіч і паставіў фільм Раман Балаян з Натальляй Андрэйчанка і Аляксандрам Абдулавым у галоўных ролях. У Тадароўскага экранная гісторыя перанесена ў нашыя дні, у Маскву, а дакладней — у Падмаскоўе, у дачны дом. Адсюль, відаць, і назва.

У гэтай гісторыі Кацярына Ізмайлава ператварылася ў машыністку Кацю, яе палюбоўнік, прыказчык Сяргей, стаў сталяром-чырванадрэўшчыкам, свёкар, купец Барыс Цімафеевіч, — свекрывёй-пісьменніцай Ірынай Дзмітрыевай, уладальніцай дачы і машыны "Волга", муж Каці застаўся мужам, але пад іншым імем, і зусім выкінуты з дзеяння пляменнік Каці Федзя. Аднак сюжэтная схема ў агульных рысах захавана: практычна рукамі Каці забіта свякроў — Ірыну Дзмітрыеўну хапіў удар, калі яна ва ўласным доме застала нявестку ў пасцелі са сталяром, а Каця свядома не паспяшалася прынесці выратавальнае лякарства. Сяргей забіў мужа. І ў рэшце рэшт Каця расквіталася з маладзенькай саперніцай...

Тым не менш, нягледзячы на падабенства сюжэтнай канвы, да першакрыніцы новы фільм Тадароўскага не мае ніякіх адносін...

Галоўныя ролі выконваюць Інгеборга Дапкунайтэ, Аліса Фрэйндліх, Уладзімір Машкоў, Аляксандр Фяклістаў, Юрый Кузняцоў.

"Апошняя субота"

Новую каляровую мастацкую кінастужку з такой назвай перадаюць на суд гледачоў кінамайстры Украіны. Пастаноўку карціны паводле сцэнарыя Вольгі Міхайлавай ажыццявіў рэжысёр Сяргей Лінкоў.

Гэта меладрама характэрна перш за ўсё тым, што ў ёй заняты два самыя значныя на сённяшні дзень маладыя акцёры Яўген Міронаў і Яўген Сідзіхін, без якіх не абыходзіцца сёння ніводзін больш-менш сур'ёзны фільм. Нагадаем хоць бы "Каханне", "Анкор, яшчэ анкор!" з Міронавым або "Бездань", "Дзеці чыгунных багоў" з Сідзіхіным. Да таго ж, акцёрскую кампанію маладым склаў адзін з лепшых майстроў экрана старэйшага пакалення Іван Лапікаў, які сыграў тут сваю апошнюю, бадай, ролю ў кіно.

А калі дадаць да вышэйсказанага, што "Апошняя субота" — фільм пра каханне, а дакладней, трохкутнік кахання, фільм, у якім пачуцці герояў агалены настолькі, что адзіным пазбаўленнем ад іх можа быць толькі смерць, дык няцяжка прадказаць поспех у гледачоў. І яшчэ падкупляе, што фільм гэты надзвычай цнатлівы, няма ў ім голых цел і грубых нецэнзурных слоў.

...Дэмабілізаваны салдат Саша Шырокаў прывёз да сябе дадому прыгажуню-жонку Святлану. Жыў ён у маленькім правінцыяльным гарадку, усе жыхары якога, як у вёсцы, ведаюць адзін аднаго. Адзначылі вяртанне Сашы шырока, весела. Усе адобрылі яго выбар, праўда, свекрыві не спадабалася, што Святлана прыехала амаль з голымі рукамі, як быццам не збіралася доўга заседжвацца ў доме мужа. І яшчэ ёй не спадабалася, што нявестка курыць. Быў на той гулянцы Сашаў сябар Алег. Высокі, дужы, ён адрозніваўся шумным, вясёлым характарам і напорыстай упэўненасцю ў сабе. Алег з першага погляду закахаўся ў Святлану і не збіраўся ўтойваць сваіх бурных пачуццяў ні ад каго, у тым ліку і ад Сашы...

У галоўных ролях выступаюць Алеся Дарошына, Яўген Сідзіхін, Яўген Міронаў, Іван Лапікаў, Людміла Палякова, Аляксандр Карнавушкін.

"Маленькі прынц"

Карціна створана рэжысёрам Андрэем Росам на сахалінскай кінастудыі "Авантэс" па матывах аднайменнай казкі Антуана дэ Сент Экзюперы.

Узяўшы за аснову цудоўную казку Экзюперы, аўтары фільма знялі філасофскую прытчу пра дзяцінства і мару. Пра цяпло, якога заўсёды не хапае. Пра каханне, аб якім марыш з ранняга юнацтва.

Маленькі прынц і лётчык крочаць па планетах. Яны пройдуць сусветы, дзе пануюць багацце і ўлада, ганарыстасць і беднасць. Маленькі прынц убачыць жыццё, спазнае, хто ёсць хто, і вырашыць вярнуцца да пачатку. У яго ёсць свая планета, дзе яго чакае Ружа, маленькая безабаронная кветка. Прынц павінен вярнуцца туды.

У фільме здымаліся Аляксандр Шчарбакоў, Алег Рудзюк, Андрэй Рос.

Тэатры

28—29 сакавіка
Пачатак у 19.00

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

29 сакавіка — **"Страсці па Аўдзею"**.

Заказ білетаў і даведкі па тэл. 27-17-17.

ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА

28 сакавіка ў 11.30 — **"Чыпаліна"** (балет), вечарам — **"Яўген Анегін"** (опера),

29 сакавіка ў 11.30 — **"Сцеражыцеся, Баба-Яга!"** (опера-казка), вечарам — **"Карсар"** (балет).

БЕЛДЗЯРЖФІЛАРМОНІЯ
(зала камернай музыкі)

28 сакавіка — канцэрт камернай музыкі. **Л.Балыка** (флейта), **А.Аўраменка** (фагот). Партыя фартэпіяна — **А.Бузук**, **В.Сідараў**. У канцэрце прымае ўдзел ансамбль флейтыстаў **"Сірынкс"**. Мастацкі кіраўнік — **Н.Аўраменка**. У праграме: Вівальдзі, Тэлеман, Франк, Калівода, Рахманінаў, Машкоўскі.

В "зале" суда — сотни тысяч зрителей

Видеокамера стала непременной спутницей работников хозяйственного суда Витебской области.

Выездные заседания, многие расследования конфликтов фиксируются на пленку, а затем превращаются в острые, нелицеприятные передачи Витебской телестудии с участием председателя суда Валерия Александрова.

Одному из нашумевших дел — о бедственном положении жилищно-строительных кооперативов, брошенных на произвол судьбы Витебским горисполкомом, — посвящена передача "Дом без мезонина", которая будет показана по республиканскому телевидению 28 марта в 16.15. Время, конечно, неудобное. Но таков и сюжет, в котором на фоне жилищного кризиса красуются "руководящие" особняки...

Максим АРХИПОВ.

ПРАГРАМА ТЭЛЕПЕРАДАЧ

Аўторак, 28 сакавіка

Беларускае тэлебачанне

12.15 "Аперацыя "Ы" і іншыя прыгоды Шурыка". Мастацкі фільм.
13.45 "Кветка папараці". Музычны фільм.
14.40 "Усе мы родам з дзяцінства". II Усебеларускі тэлефестываль юных талентаў.
16.15 "Дом без мезаніна". Перадача з Віцебска.
16.45 У нас дома. Праграма для сям'і.
17.20 "Мой лёс пралёг праз вашыя дарогі..." Творчы вечар пісьменніцы Вольгі Іпатавай. Частка 2-я.
18.00 АТН, Бі-бі-сі, Сі-эн-эн.
18.45 Урокі Наталлі Наважылавай.
19.15 У свеце навукі. Малое навукова-інавацыйнае прадпрыемства.
19.45 "Маё каханне, мой смутак".
20.15 Студыя "Эксклюзіў". І гэта жыццё.
20.20 Футбол. Зборная Чэхіі — зборная Беларусі. Чвэрць гадзіны перад матчам.
20.35 Прэм'ера цыкла. "Скрыжалі". Прытчы цара Саламона.
20.40 Калыханка.
21.00 Навіны.
21.40 Студыя "Палітыка".
21.55 Кліп-канцэрт. Ул.Праснякоў, А. Глызін.
22.10 "Барні Барната". Мастацкі фільм. 4-я серыя.
23.15 Шоу-прагноз.
23.20 Навіны.
23.35 Эканамікст.
23.45 Пад купалам Сусвету.
23.55 "Золата партыі". Маст. фільм.

Канал "Астанкіна"

9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50 Навіны.
14.00 Дзверы ў малы бізнес.
14.20 Справа і права.
14.30 Хроніка дзелавога жыцця.
14.40 Культура і бізнес.
15.00 Чароўны свет, ці Сінема.
15.20 Брэйн рынг.
16.00 Джэм.
16.20 "Элен і хлопцы".
16.50 Свет сёння.
17.00 Рускі мір.
17.30 Загадка СБ.
17.45 "Хто ёсць хто". Д.Кензэдзі.
18.00 Гадзіна пік.
18.30 "Дзікая Роза".
18.55 Мы. Аўтарская праграма У.Познера.
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
20.40 З першых рук.
20.55 "Залатая маска". Уручэнне прызоў Саюза тэатральных дзеячаў.
22.15 Канал ілюзій.
23.00 Тэлемемуары.
23.35 Відэамікс.
23.50 Прэс-экспрэс.
24.00 За кулісамі.

Канал "Расія"

11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
11.05, 13.20 Дзелавая Расія.
13.45 "Знікненне пана Давенхейма". Фільм серыяла "Эркюль Пуаро".
15.05 Там-там навіны.
15.20 Свята кожны дзень.
15.30 "Жарабец-хітрун". Мастацкі фільм. 3-я серыя.
16.05 І помніць свет...
16.35 Рэпартажы з месцаў.
16.45 У гэты дзень...
16.50 Казкі для бацькоў.
17.20 Ніхто не забыты.
17.25 Кар'ера.
17.55 Ваша права.
18.10 L-клуб.
19.25 Падрабязнасці.
19.35 "Кеома". Мастацкі фільм.
21.25 Астралогія кахання. І.Панароўская.
22.30 Рака часу.
22.40 Аўтаімгненне.
22.45 Экран крымінальных паведамленняў.
22.55 "Апошні кантракт". Мастацкі фільм. 4-я серыя.
23.45 Плошча мастацтваў. "Венецыянскі карнавал".

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інформ ТБ.
12.10 "Няўлоўны Фунцік". Мультфільм.
12.30, 14.45, 17.50 Музычны момант.
12.35 "Нямецкая хваля".
13.00 Хуткая дапамога.
13.30 "Мануэла".
14.15 "Фунцік і старая з вусамі". Мультфільм.
14.50 "Свецік". Мастацкі фільм.
16.15 Чароўная лінія.
16.30 "Там, дзе жыве Павуціныч".
16.45 "Як трапіць у Лукамор'е". Перадача 2-я.
17.05 "Артысты цырка Ермалаевы". Фільм-канцэрт.
17.55 Па ўсёй Расіі.
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.00 Тэлебліц.
19.10 Вялікі фестываль.
19.25 "Мануэла".
20.10 "Сівы Урал". Тэлефільм.
20.25 Як слова наша адгукнецца.
21.15 Тэлеслужба бяспекі.
21.45 Спартыўныя навіны.
21.55 Гараскоп.
22.10 "Чалавек, які не хацеў паміраць". Мастацкі фільм (Італія).
23.40 Дом кіно. Зорка тэатра і кіно Сяргей Макавецкі.
0.40 "Ювелірная справа". Мастацкі фільм.

8-ы канал

18.00 Мультфільм "Найвялікшыя прыгоды храбрага жабяняці".
18.30 Нямецкая хваля.
19.00 ІНТЭКС: "Навіны".
19.15 Тэлесерыял "Арбалет".
19.45 Муз-парад.
20.00 Мультфільм "Ружовая пантэра".
20.15 Welcome to.
20.30 Тэлесерыял "Горац". 20-я серыя.
21.30 Студыя БМ.
21.45 Фантастыка на экране. Мастацкі фільм. "Мая мачаха — іншапланецянка".
23.45 Погляд з Амерыкі.

НТБ

17.05 "Беверлі-Хілз, 0210".
17.00 "Прынц і жабрак".
17.35 "Успомнім тыя гады. 1957".
18.00, 21.00, 23.00 "Сёння".
18.35 Спартыўны калейдаскоп.
19.10 Свет кіно. "Сябар маёй сяброўкі".
21.35 "Паліцыя Маямі. Аддзел нораваў".
22.30 Часінка.
23.15 Меламанія: "Рэй Чарльз".

Надвор'е

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, часам ападкі. Тэмпература паветра ў Віцебску — 2—4, Мінску, Магілёве, Гродне — 3—5, Брэсце, Гомелі — 5—7 градусаў цяпла. У наступныя двое сутак месцамі чакаюцца ападкі. Тэмпература ўначы 0—5 градусаў марозу, 29-га — да мінус 7, удзень — 0—5 градусаў цяпла.

Астранамічны каляндар — 28.03

Узыход і захад сонца: Мінск — 6.53, 19.37; Віцебск — 6.42, 19.28; Магілёў — 6.42, 19.26; Гомель — 6.38, 19.24; Гродна — 7.06, 19.54; Брэст — 7.10, 19.51.

Даўжыня дня ў Мінску — 12 гадзін 44 хвіліны.

Маладзік — 31 сакавіка.

Народная газета

Даведкі па тэл.: 68-28-70, 68-25-59.
Рэкламнае бюро — тэл. (0172) 68-28-11, тэл./факс (0172) 68-25-29, 68-25-28.

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Індэкс 63868

Заснавальнік — Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь.
Адрас: Мінск, вул. К. Маркса, 38.
Выходзіць штодзённа, акрамя нядзелі і панядзелка. 250 разоў у год.
Падпісана ў друк у 19.10. Зак. 735
Газета аддрукавана ў друкарні выдавецтва "Беларускі Дом друку". Адрас: Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.
Спосаб друку — афсетны, фармат А-2
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

В. а. галоўнага рэдактара Мікалай ГАЛКО.

Зашумят элитные леса

Учитывая сложную экономическую, экологическую и социальную ситуацию в лесной отрасли, правительство Беларуси обратилось ко Всемирному банку реконструкции и развития с просьбой о выделении кредита в размере 41,9 миллиона долларов под Проект развития лесного хозяйства страны.

Среди других неотложных задач, которые можно будет решить с помощью полученных средств, особое место занимает строительство селекционно-семеноводческого центра. О необходимости существования в Беларуси такой организации давно говорили ведущие лесоводы и промышленники. Выявить, сохранить, улучшить и размножить ценнейший генетический фонд основных лесообразующих культур — цель создания центра.

Экономический эффект от улучшения семеноводства можно получить в кратчайшие сроки. Использование для проверки генетической ценности семян аттестованного по международным стандартам оборудования позволит обеспечить сертификатами качества все их запасы, что повысит спрос на них на внешнем рынке. В долговременной перспективе центр обеспечит все лесные хозяйства элитным посадочным материалом.

Леса Беларуси станут намного продуктивнее, устойчивее к антропогенным воздействиям.

Александр ВЛАДИМИРОВ.

А што ў правінцыі?

У бібліятэку — за гаючай вадзіцай

Гатуе цуда-ваду загадчыца Латыгальскай сельскай бібліятэкі Сенненскага раёна Валянціна Алексяенка. Яна ж збірае для наведвальнікаў, у асноўным пажылых людзей, звесткі аб лекавых травах, спосабах прыгатавання зёлак у дамашніх умовах. У пэўныя дні запрашае для кансультацый урача ці фельчара.

Домам народнай медыцыны называюць гэту невялікую ўстанову культуры. І іншыя бібліятэкі Сенненскага раёна становяцца шматфункцыянальнымі. У музей кветак, дзе можна атрымаць чаранкі і парады, ператварылася дзякуючы намаганням Ірыны Шыбекі Краснасельская бібліятэка, у музей цацак — Студзёнкаўская. У "Беларускай хатцы" сярод дзіўных рэчаў мінулага стагоддзя выдае кнігі ў Белай Ліпе Зінаіда Шульга.

Белінфарм.

СПОРТ

По такому поводу и выпить не грех. Пива от "Крыніцы"

Главное спортивное событие минувших выходных, — безусловно, выход хоккейной сборной Беларуси в сильнейшую группу "В".

Этого ждали белорусские болельщики, на это надеялись. Сомнения, правда, были, ведь в финальной пульке пришлось играть с командами Казахстана и Украины. Пронесло!

Многое решалось в первой игре белорусов с украинцами. До этого матча "жовті-блакітныя" сыграли вничью с казахами, и, естественно, проигрыш "бел-чырвона-белым" открывал им дорогу только в Киев. К нашему счастью и к сожалению украинцев, сборная Беларуси победила — 3:1.

...Когда на 7-й минуте первого периода игрок сборной Казахстана Антипин забросил в ворота белорусов первую шайбу, кой у кого нет-нет да и пронеслась шальная мысль: а вдруг команда Андрея Сидоренко не выстоит. Правда, уже через две минуты Андрей Ковалев уравновесил расшатавшиеся сомнения — 1:1 (напомню, что ничья устраивала нашу команду), а за 27 (!) секунд до конца игры после броска все того же Ковалева, лучшего бомбардира Германии, мечты казахов на выход в группу "В" разбились, как драгоценная китайская фарфоровая ваза эпохи Мин. 2:1 — победа нашей сборной и "зеленый" свет в более элитную группу.

Кстати, с прошлого года генеральным спонсором Федерации хоккея Беларуси стало АП "Крыніца". Неужто пиво хоккеистам помогло?

Алесь СИВЫЙ.

Медведь и иже с ним

В минском Дворце спорта закончился 26-й международный турнир по вольной борьбе на призы А.Медведя.

230 участников из 22 стран мира три дня оспаривали награды в десяти весовых категориях.

Красочным было торжественное открытие, на котором присутствовал президент Беларуси, другие руководители, состоялся небольшой концерт.

Больше всего главных призов досталось украинским борцам. Из группы завоевавших медали разного достоинства среди белорусских борцов лучшим был Сергей Смаль (весовая категория до 62 кг). По одной высшей награде получили также борцы Азербайджана, России, Германии, Латвии и Эстонии.

Вильям ОСТРИНСКИЙ,
внештатный корреспондент.

ЧЕЛОВЕК В ИСКУССТВЕ

"Как прекрасен этот мир!" — утверждает всю свою жизнь художник Петр Явич

Сергей БУТКЕВИЧ

Петр Явич появился на свет под счастливой звездой. Хотя обстоятельства поначалу не предполагали большой удачи. Солдат русской армии Макс Явич из Витебска угодил в плен на австро-венгерском фронте первой мировой войны. Его определили в работники к жителю города Тёрёксентмиклоша, кузнецу Матузу, главе огромного семейства. Дочь хозяина, Илона, полюбила чужестранца. В 1918 году у них родился сын Иштван. Через 7 лет Макс вернулся на родину со своей "заграничной" семьей.

— Как тебя зовут? — спросили новенького в школе.

— Пишта, — ответил мальчик: так его называла мама.

— Значит, Петя...

И стал Иштван Петром.

После бедной жизни в хортистской Венгрии для Пишты-Пети началась совсем иная пора. Он уже не зарабатывал подзатыльники от учителей за изрисованные обложки. На родине отца бумага стоила копейки, и школьные тетради можно было оставить в покое. Но главное — Петр Явич вскоре стал учеником знаменитого Юрия Пэна.

Чудесный случай: художнику понадобилось перевести текст из присланного ему венгерского журнала. Сделать это смогли только Макс и его жена, рассказавшие заодно прославленному портретисту об увлечении сына...

...Нынешние рассуждения о витебской художественной школе разноречивы. Источниками, питавшими ее, называют и супрематизм, и абстракционизм, и сюрреализм. Но что бы ни говорили, в основе наиболее стойких ее традиций — искусство "передвижников", органично воспринятое Юрием (Иегудой) Пэном и переданное им большинству учеников.

Следы просиявшего, подобно комете, и отторгнутого, надолго забытого Шагала, еще более мимолетного Малевича и других авангардистов проступили в Витебске лишь недавно в творчестве нового, послевоенного поколения художников. Почти все, кто постарше, прямо или косвенно вышли из мастерской Пэна и аудиторий Витебского художественного училища, где царил реализм.

Явич — безусловный наследник мастеров старой, "академической" закваски. С дороги, указанной ими, он не сворачивал никогда. Его последовательная верность натуре, традиционной манере станковой живописи, которая культивировалась в училище преподавателями В.Дежицем, И.Ахремчиком и другими, просто поразительна. То, что называется "ремеслом" — живописные приемы, представления о гармонии, композиции, — заставляет вспомнить Саврасова, Сурикова, Левитана. И все-таки Явича-портретиста "сделал" Пэн с его лиризмом, человечностью, чувствительностью, особым вниманием к "простым" людям.

Уже в 1940 году "Портрет девушки", показанный Явичем на местной выставке, был куплен Государственным художественным музеем БССР. Известность Петра нарастала стремительно. Но началась война, и все свои кисти и краски он сложил в чемодан и закопал в деревне Старинцы, на родине жены Лиды...

...Судьба сложилась так, что первой наградой красноармейца Явича стала медаль "За освобождение Будапешта". А первыми послевоенными живописными работами — огромные, на простынях, портреты Сталина и других членов Политбюро, сделанные по приказу армейского начальства "для пропаганды советской власти среди венгерского народа".

Вернувшись в 1946 году в Витебск, Явич еще не раз выполнял подобные официальные заказы. Без этого было трудно прожить, да и попробуй не дай согласия. Но каждая новая выставка знакомила зрителей с другим, настоящим Явичем, с его прекрасными портретами земляков.

Явич никогда не писал людей, которые были ему безразличны. Его портреты — либо дань глубокого уважения к человеку, либо признание в любви к нему. Он не кривил душой, создавая привлекательные образы партизанских вождей Шмырева и Райцева, литейщиков, ткачих, колхозниц. Благодаря ему имеем мы сегодня портретную галерею замечательных артистов-коласовцев: Ильинского, Молчанова, Родзяловской, Звездочетова... Он запечатлел множество соотечественников, перенося на полотна черты пожилых и молодых женщин и мужчин, детей, студентов, воинов. И, конечно же, своих близких: матери, красавицы жены, сына, дочери.

Кому-то все это покажется произведениями ортодоксального, "неподвижного" реализма. Сторонникам беспредметного искусства Явич, наверное, представляется вконец устаревшим. Но жизнь — упрямая штука, и получается так, что все ирреальное, экстравагантное, умозрительное в искусстве остается уделом неширокого круга ценителей. А реализм, порой чуть-чуть отступая, вновь и вновь выходит на давно и прочно завоеванный рубеж первенства.

Явич никогда не был в тени, среди отвергнутых, хотя попытки "отодвинуть" его случались. Выполненные им в классическом стиле натюрморты равно восхищали и неподготовленную публику, и вполне изощренных эстетов. Цветы на его полотнах — от роскошных пионов до скромных ромашек — одухотворены, опоэтизированы. Его пейзажи, вдохновленные неповторимой природой Витебщины, достойны самых престижных галерей. Многие из них, кстати, разошлись по художественным собраниям Германии, Японии, Польши. И, конечно, Венгрии, где в 1989 году была организована выставка Иштвана-Петра Явича, обошедшая несколько городов — от его родного Тёрёксентмиклоша до Будапешта.

Сейчас Петру Максовичу — 76 лет. Почти полвека он отдал любимому искусству.

— Жизнь теперь нелегкая, — говорит художник. — Но все-таки она прекрасна. Надо только уметь видеть это и радоваться окружающему нас миру.

ОТ РЕДАКЦИИ:
Когда этот материал готовился к печати, в нашей газете был опубликован указ о награждении художника Почетной грамотой Президиума Верховного Совета Беларуси. Из-за досадной оплошности в отчество награжденного вкралась опечатка... Пользуясь случаем, приносим Петру Максовичу свои извинения, а главное — от всей души поздравляем с высокой наградой и желаем творческого долголетия!

На репродукциях — картины Петра Явича: "Девочка с букетом", "Натюрморт с розами", "Автопортрет".



НАВІНЫ КУЛЬТУРЫ



Традыцыйны конкурс спартыўных бальных танцаў "Парад надзей-95" прайшоў у Віцебску. 123 пары з Брэста, Мазыра, Мінска, Санкт-Пецярбурга, Харкава і іншых рэгіёнаў СНД аспрэчвалі званне мацнейшых.

Конкурс стаў таксама своеасаблівай творчай лабараторыяй, дзе яго ўдзельнікі абмеркавалі праблемы "жанру".

❑ ***Фрагменты конкурсных выступленняў.***

Фота Аляксандра ХІТРОВА,
Белінфарм.

Когда просыпаются оборотни

История о том, как отстраненный от должности лесничий стал опаснее волка

Виктор ЛЕЩЕНКО

Владимир Владимирович Лопухов был не просто лесничим в Гродненском районе, он был человеком, в котором многие нуждались, как в тугом кошельке при строительстве дачи, как в счастливом ключнике у закрытой двери. К нему шли за лесом для дома. Какой-нибудь важной "птице" мог отпустить дерева и больше, чем официально выписано, либо вообще отдать без всяких документов. Его почитали, знакомством с ним гордились.

И все бы ничего, но несколько лет назад прислали к нему мастером выпускника института В.Жидковича, который вдруг начал требовать наведения порядка в лесу и выступил открыто против своего начальника. Тот встал на дыбы:

— Убирайся! Нам с тобой не сработаться.

Однако новичок не был похож на тростинку, которая гнется от любого дуновения. Разразившийся скандал перерос в бурю. Она-то и оторвала Владимира Владимировича от богатой кормушки. Впрочем, "ценного" сотрудника не забыли, а подыскали ему в родных пенатах другую должность, но более бумажную. И пока суд да дело — отправили в отпуск. Жидковича же поставили исполняющим обязанности лесничего.

"Отставник" поначалу пробовал помириться с "наследником". Понимал — это единственный шанс вернуться в прежние владения. Но и.о.лесничего напрочь отказался встречаться с зарвавшимся "помещиком". Раз дерево не гнется, его ломают. Через верных людей удалось связаться с неким самбистом Виталием и обговорить щекотливые нюансы предстоящей "рубки".

План был продуман до мелочей. Бунтаря заманивают в лес, когда тот будет на машине. Затем накачивают снотворным, сбрасывают автомобиль со спящим водителем в кювет и поджигают. Обычный несчастный случай. Кто будет в нем разбираться?..

15 октября возле деревни Зеленая Гродненского района охота была открыта. Лопухов на дороге тормознул УАЗик своего преемника:

— Слушай, помоги. У меня в "шестерке" бензина на нуле. Плесни пару литров.

Они съехали с трассы на полянку, где стоял автомобиль Лопухова. Жидкович дал немного горючего. Его бывший шеф, словно благодарный частник, засуетился, мигом разложил на капоте закуску, достал бутылку водки, в которую подсыпал заранее снотворное. Но гость, пригубив лишь немного из стакана, засобирался:

— Некогда.

Возможно, он каким-то чувством уловил холодок опасности, понял, что оказался в западне. Но вырваться из нее ему так и не удалось. Хозяин застолья вдруг набросился на него и начал душить.

Из "жигуленка" выскочил нанятый самбист.

Лопухов кричал:

— Бери водку! Лей ему, пусть напьется!

Однако у Виталия ничего не получилось. Лопухов метнулся к машине. Схватил монтировку и принялся ею бить по голове Жидковича...

Затем они перетащили тело в глубь леса. "Организатор" положил на горло жертве монтировку и надавил на нее.

— Дави и ты,— скомандовал он Виталию.

— Да ему и так не выжить.

— Делай, что велено!

Когда "командир" отправился отгонять подальше УАЗик "казненного", у Виталия, оставшегося в одиночестве возле изуродованного мертвого и.о.лесничего, сдали нервы, он рванулся на дорогу.

Вскоре его догнал на "шестерке" работодатель и, затолкнув в машину, повез обратно на кровавое токовище. Они закопали труп. Затем "могилу" полили бензином (чтобы звери не разрыли), а наверх перетянули муравейник.

По пути в Гродно Лопухов приговаривал:

— Не бойся. Жаль только, что все получилось не так, как планировал.

Через два дня тело и.о. лесничего было найдено. Владимир Владимирович как ни в чем не бывало вышел на работу. Но на прежние "малиновые" места его не отправили. Подобного он не ожидал. К тому же сослуживцы перестали с ним здороваться, пошли разговоры, что именно он убийца. Лопухов написал "по собственному желанию" и уволился. После его арестовали, однако через пару дней выпустили, не сумев доказать вину.

Затем бывший лесничий перебрался в замы директора одного совместного предприятия, где исправно и мирно трудился, вел добропорядочный и ничем не примечательный образ жизни.

